МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

БЕЛАРУСКІ
ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

ЗАГАД

МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

БЕЛОРУССКИЙ
ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ

ПРИКАЗ

20.02.2025 № 234-ПС

г. Минск

О проведении
Республиканского литературного
конкурса «БрамаМар»

В рамках подготовки и проведения мероприятий, приуроченных к 80-летию Победы советского народа в Великой Отечественной войне

ПРИКАЗЫВАЮ:

1. Провести на факультете журналистики БГУ с 20 февраля по 3 мая 2025 года Республиканский литературный конкурс «БрамаМар» (далее конкурс).

2. Утвердить Положение о конкурсе (прилагается).

3.  Утвердить состав Оргкомитета конкурса (прилагается).

3. Контроль за исполнением данного приказа возложить на декана факультета журналистики БГУ Беляева А.В.

Проректор по учебной работе
и образовательным инновациям О.Г.Прохоренко

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад рэктара
20.022025 № 234-ПС

ПАЛАЖЭННЕ
аб Рэспубліканскім літаратурным
конкурсе «БрамаМар»

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэспубліканскі літаратурны конкурс «БрамаМар» (далей – конкурс) праводзіцца кафедрай літаратурна-мастацкай крытыкі факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (далей – кафедра) і прымеркаваны да 80-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

2. Асноўнымі мэтамі правядзення конкурсу з'яўляюцца выхаванне ў маладога пакалення духоўнай культуры як асновы ў фарміраванні грамадзянскага светапогляду, разумення і любові да айчыннай і сусветнай літаратуры, выяўленне і далейшая творчая падтрымка маладых талентаў.

3. Задачы конкурсу:

- дапамагчы таленавітым маладым аўтарам заявіць пра сябе, прайсці спецыяльны адукацыйны курс і атрымаць першую публікацыю ў адным з літаратурна-мастацкіх выданняў Беларусі.
- наладзіць камунікацыю паміж аўтарамі, стварыць пляцоўку для атрымання аб'ектыўнай крытыкі і абмеркавання твораў з крытыкамі/ літаратарамі.

4. Для падрыхтоўкі і правядзення конкурсу ствараецца аргкамітэт конкурсу з супрацоўнікаў факультэта журналістыкі БДУ, прадстаўнікоў дзяржаўных СМІ і выдавецтваў, а таксама студэнтаў БДУ. Аргкамітэт прымае заяўкі на ўдзел у конкурсе, складае прэс-рэліз (інфармацыя павінна змяшчаць звесткі аб часе, месцы правядзення конкурсу, умовах, парадку і тэрмінах абвяшчэння вынікаў, а таксама іншыя неабходныя звесткі); падрыхтоўкі і правядзення конкурсу; фарміруе склад журы; вырашае іншыя пытанні, якія ўзнікаюць у ходзе падрыхтоўкі і правядзення конкурсу.

5. Інфармацыя (прэс-рэліз) пра конкурс размяшчаецца да пачатку яго правядзення ў глабальнай сетцы Інтэрнэт на афіцыйных акаўнтах конкурсу ў сацыяльных сетках.

## ГЛАВА 2
## ЧАС І МЕСЦА ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

6. Конкурс праводзіцца з 20 лютага па 03 мая 2025 года ў г. Мінску на базе кафедры ў наступным парадку:

- да 31 сакавіка 2025 г. – прыём заявак і конкурсных матэрыялаў;
- да 14 красавіка 2025 г. – вызначэнне пераможцаў.
- да 03 мая 2025 г. – цырымонія ўзнагароджання на базе факультэта журналістыкі БДУ (г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9).

## ГЛАВА 3
## УМОВЫ І ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

7. Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца навучэнцы 8-11 класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі і студэнты 1-4 курсаў устаноў вышэйшай адукацыі (на момант правядзення конкурсу).

8. Конкурс праводзіцца ў дзвюх узроставых катэгорыях:

- "БрамаМар" (для студэнтаў 1-4 курсаў);
- "БрамаМар-Юні" (для навучэнцаў 8-11 класаў)

9. Творчыя працы прымаюцца ў наступных намінацыях:

- для школьнікаў 8-11 класаў: «Проза» і «Паэзія»
- для студэнтаў: «Паэзія», «Проза», «Крытыка» і «Драматургія»
- агульная: «Эсэ пра настаўніка» (намінацыя імя У.А. Капцава), «Буктрэйлер па творы беларускай літаратуры».

10. Работы на конкурс прымаюцца на рускай і беларускай мовах.

## ГЛАВА 4
## ПРАГРАМНЫЯ ПАТРАБАВАННІ

11. Фарматаванне: шрыфт Times New Roman, 14 пт, адзінарны інтэрвал, палі - 2 см справа і злева.

12. Файл падпісваецца так:

- Імя_Прозвішча_Намінацыя_1 (нумар дадаецца, калі ў вас больш за адну работу);

альбо :

- Имя_Фамилия_Номинация_1
- У намінацыі «Буктрэйлер па творы беларускай літаратуры» у лісце змяшчаецца інтэрнэт-спасылка на відэафайл.

13. Аб'ём работ:

- У намінацыі «Проза» - да 15 тыс. сімвалаў (без прабелаў);
- У намінацыі «Паэзія» - да 5 тыс. сімвалаў (без прабелаў);
- У намінацыі «Крытыка» - да 7 тыс. сімвалаў (без прабелаў);
- У намінацыі «Драматургія» - да 15 тыс. сімвалаў (без прабелаў);

- У намінацыі «Эсэ пра настаўніка» - да 5 тысяч знакаў (без прабелаў).
- У намінацыі «Буктрэйлер па творы беларускай літаратуры» - відэа да 1,5 хвілін, знятае вертыкальна («TikTok» фармат).

## ГЛАВА 5
## ЖУРЫ КОНКУРСУ

14. У склад журы ўваходзяць выкладчыкі кафедры, а таксама вядомыя літаратары і крытыкі.

## ГЛАВА 6
## ПАРАДАК ПАДВЯДЗЕННЯ ВЫНІКАЎ КОНКУРСУ І ЎЗНАГАРОДЖАННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ

15. Па кожнай намінацыі конкурсу журы прымае рашэнне шляхам абмену меркаваннямі і галасаваннем. Рашэнне журы заносіцца ў пратакол, які падпісваецца ўсімі членамі журы. Рашэнне журы выносіцца да 14 красавіка 2025 года.

16. Журы конкурсу мае права пры падвядзенні вынікаў конкурсу:

- узнагароджваць удзельнікаў званнямі "лаўрэат" у кожнай намінацыі.
- адправіць падзячны ліст на адрас установы адукацыі, у якім навучаецца ўдзельнік, і ва ўпраўленні па адукацыі адміністрацый раёнаў горада Мінска;
- не прысуджаць ніякіх узнагарод.

17. Пераможцы конкурсу вызначаюцца ў кожнай узроставай катэгорыі і ў кожнай намінацыі. Пераможцы ўзнагароджваюцца дыпломамі з прысваеннем звання «лаўрэат».

18. Лаўрэаты конкурсу рэкамендуюцца да публікацыі ў рэспубліканскіх літаратурных выданнях.

19. Дыпломы лаўрэата конкурсу можна будзе атрымаць у рамках цырымоніі ўзнагароджання на факультэце журналістыкі БДУ або па ўзгадненні з аргкамітэтам.

## ГЛАВА 7
## АПРАЦОЎКА ПЕРСАНАЛЬНЫХ ЗВЕСТАК УДЗЕЛЬНІКАЎ

20. Персанальныя звесткі ўдзельніка, указаныя ў заяўцы (дадатак 1), апрацоўваюцца на падставе пісьмовай згоды.

21. Мэтай апрацоўкі адпаведных персанальных звестак з'яўляецца інфармацыйнае забеспячэнне правядзення конкурсу, у тым ліку рэгістрацыя ўдзельнікаў, складанне пратаколаў журы, размяшчэнне вынікаў конкурсу ў сацыяльных сетках конкурсу.

# ГЛАВА 8
# ПАРАДАК ПАДАЧЫ ЗАЯВАК

22. Для ўдзелу ў конкурсе не пазней за 31 сакавіка 2025 года ўключна трэба даслаць ліст з заяўкай на наступны электронны адрас: bramamar.bsu@gmail.com

23. У заяўцы павінна быць указана наступная інфармацыя:

- Прозвішча, імя, імя па бацьку;
- Для школьнікаў: школа, клас;
- Для студэнтаў: універсітэт, факультэт, курс;
- Намінацыя, у якой збіраецеся ўдзельнічаць;
- Назва вашай работы;
- Згода на апрацоўку персанальных звестак.

Да заяўкі прымацоўваецца файл з творчай работай або спасылка на відэа з буктрэйлерам па творы беларускай літаратуры.

24. Заяўкі, якія паступілі пазней за вызначаны тэрмін, а таксама няпоўныя пакеты дакументаў аргкамітэтам не разглядаюцца.

# ГЛАВА 9
# АДРАС АРГКАМІТЭТА

220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, д. 9, факультэт журналістыкі, Рэспубліканский літаратурны конкурс «БрамаМар». Тэлефон/факс: (017) 259 74 00.

Куратар конкурсу: Чарнякевіч Аксана Пятроўна.

Студэнцкі куратар конкурсу: Станкевіч Вераніка Сяргееўна.

Тэлефон: (017) 2597024, e-mail: bramamar.bsu@gmail.com

Дэкан факультэта журналістыкі А.В.Бяляеў

Дадатак 1
да Палажэння
аб Рэспубліканскім
літаратурным конкурсе
«БрамаМар»

ЗАЯЎКА

на ўдзел у Рэспубліканскім літаратурным конкурсе «БрамаМар» імя У.А. Капцава

| | |
|---|---|
| Намінацыя ў конкурсе | |
| Назва работы | |
| Прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка / удзельніцы (поўнасцю), узрост, нумар тэлефона, адрас электроннай пошты, з якога былі высланы конкурсныя работы | |
| Поўная назва ўстановы адукацыі, паштовы адрас<br>Для школьнікаў: клас<br>Для студэнтаў: факультэт, курс | |
| Факс, электронны адрас установы адукацыі | |
| Прозвішча, імя, імя па бацьку (поўнасцю) педагога або куратара (калі ёсць) | |
| Кантактны нумар тэлефона педагога або куратара (калі ёсць) | |

З умовамі конкурсу згодны / згодна ___________________________________

*(подпіс удзельніка / удзельніцы)*

Я даю згоду Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту (220030, г. Мінск, пр. Незалежнасці, д. 4) на апрацоўку пазначаных персанальных звестак для разгляду маёй заяўкі на тэрмін правядзення конкурсу. Мне растлумачаны і зразумелыя правы, звязаныя з апрацоўкай маіх персанальных звестак, механізм іх рэалізацыі, а таксама наступствы дачы (адмовы ў дачы) гэтай згоды.

Я азнаёмлены(а) з тым, што згода на апрацоўку персанальных звестак можа быць адклікана шляхам падачы пісьмовай заявы або ў выглядзе электроннага дакумента.

| ________________ | ______________________ | _________________ |
|---|---|---|
| (дата запаўнення) | (подпіс удзельніка) | (прозвішча, ініцыялы) |

| ________________ | _________________________ | ____________________ |
|---|---|---|
| (дата запаўнення) | (подпіс педагога/куратара) | (прозвішча, ініцыялы) |

Дадатак да
Загада рэктара
_______№______

Арганізацыйны камітэт

Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу «БрамаМар» імя У.А. Капцава

1. Чарота Аляксей Іванавіч – намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі, галоўны рэдактар часопіса «Неман»;
2. Бадак Аляксандр Мікалаевіч – дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура»;
3. Рацэвіч Вольга Станіславаўна – галоўны рэдактар часопіса «Маладосць»;
4. Шніп Віктар Анатольевіч – галоўны рэдактар часопіса «Полымя»;
5. Перагудава Людміла Іванаўна – галоўны рэдактар часопіса «На экранах»;
6. Цімошык Ларыса Іванаўна – аглядальнік па культуры газеты «Звязда»;
7. Бяляеў Аляксей Віктаравіч – дэкан факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта;
8. Хмель Лізавета Раманаўна – намеснік дэкана па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта;
9. Саянкова Людміла Пятроўна – загадчыца кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук, дацэнт;
10. Чарнякевіч Аксана Пятроўна – куратар конкурсу ад кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
11. Станкевіч Вераніка Сяргееўна – студэнцкі куратар конкурсу.